

Новыя правы мігрантаў



Што рабіць з трухлявым домам?



Як у глыбінцы змагаюцца са злачыннасцю

СТАР. 2



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

25 лістапада 2015 г. СЕРАДА № 228 (28086) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


# ВЫВЕСЦІ СПОРТ НА БОЛЬШ ВЫСОКІ ЎЗРОВЕНЬ

## Як гэта зрабіць — абмяркоўвалася на нарадзе ў Прэзідэнта

**Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў выбудаваць адзіную эфектыўную сістэму падрыхтоўкі рэзерву спартсменаў для нацыянальнай зборнай па хакеі. Гэта тэма сярод іншых абмяркоўвалася на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы, якая была прысвечана пытанням развіцця хакея ў Беларусі, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта тэма абмяркоўваецца не ўпершыню. «Гэтаму віду спорту ў нас у краіне надаецца вялікае значэнне, яго любяць балельшчыкі», — заўважыў ён.

Разам з тым Прэзідэнт выказаў занепакоенасць у сувязі з існуючай сітуацыяй у гэтым відзе спорту. «Тое, што цяпер адбываецца ў названай сферы, насцярожвае, і ўжо даўно пара ўважліва разабрацца з усімі аспектамі гэтай праблемы. Так проста быць не павінна. Калі гэта будзе прадаўжацца, то ў найкарацейшыя тэрміны будуць прыняты самыя радыкальныя меры», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што аб гэтай сустрэчы папрасілі некаторыя з прысутных на нарадзе. «Я далёкі ад таго, каб мы сёння разгледзелі нейкія прынцыповыя пытанні. Думаю, што на маім узроўні, на ўзроўні дзяржавы яны ўсе вырашаны. Можа, ёсць нейкія праблемы больш дробныя. Калі ласка, я гатовы да іх абмеркавання», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Што датычыцца «Дынама», то мы ідзём ад лепшага да горшага як мінімум. Такая гульня, што сёння можам выйграць з розніцай 5 шайбаў, а заўтра з такой жа розніцай прайграць па сіле такой жа камандзе, як учора, нікуды не варта. Няма ніякай стабільнасці», — выказаў незадавальненне кіраўнік дзяржавы.

Пры гэтым ён нагадаў: дзяржава ўклала немалыя грошы, каб хакей развіваўся, і мае права чакаць належнай аддачы. «У дзяржавы няма лішніх грошай, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Пара пераходзіць на акупнасць, самаакупнасць. Ёсць клубы, няхай зарабляюць грошы. Што зарабілі, няхай трацяць згодна з тымі законамі, якія ёсць у краіне. А падтрымка будзе скарачацца, як гэта было прынята ў адпаведнасці з маімі рашэннямі».

Старшыня Федэрацыі хакея Ігар Рачкоўскі далажыў аб сітуацыі ў гэтым відзе спорту, у тым ліку аб падрыхтоўцы да чэмпіянату свету 2016 года ў Расіі, аб фарміраванні і функцыянаванні нацыянальнай зборнай па хакеі. «Сёння вострых і праблемных пытанняў няма. Адзіную непрыемную сітуацыю нам «падарылі» нашы расійскія калегі, калі пасля старту ў КХЛ быў зменены рэгламент спаборніцтваў у частцы легіянерскага статусу беларусаў. І гэта нягледзячы на цвёрдыя запэўненні міністра спорту Расіі і кіраўніка Федэрацыі хакея Расіі, што такой сітуацыі ў бліжэйшыя гады не адбудзецца. Да вырашэння гэтай праблемы мы падключылі нават прэзідэнта Міжнароднай федэрацыі хакея Рэнэ Фазеля і дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Рыгора Рапоту, які накіраваў у адрас Міністэрства спорту Расіі пісьмо аб недапушчальнасці такіх дзеянняў», — расказаў Ігар Рачкоўскі.

Акрамя таго, на нарадзе абмяркоўвалася прапанова Федэрацыі хакея аб правядзенні ў Мінску чэмпіянату свету 2022 года.

Прэзідэнт у час нарады асаблівую ўвагу ўдзяліў пытанням падрыхтоўкі рэзерву для нацыянальнай зборнай па хакеі, прычым без стварэння дадатковай інфраструктуры. Гэта сістэма не павінна быць канцэптуальна новай, размова ідзе толькі аб дакладнай сістэматызацыі работы. А за аснову будзе ўзяты лепшы замежны вопыт, напрыклад, канадскі.

На нарадзе разглядаліся і іншыя праблемы, вырашэнне якіх дасць магчымасць узняць на больш высокі ўзровень падрыхтоўку будучых зорак хакея. Напрыклад, адно з прынятых на ўзроўні Прэзідэнта рашэнняў — будаўніцтва арэнднага жылля для маладых трэнераў, якія працуюць з таленавітымі спартсменамі. Ключавое патрабаванне кіраўніка дзяржавы — апірацца трэба на айчынныя спартыўныя таленты. Важна толькі ўмець іх знайсці і належным чынам падрыхтаваць.

Пытанні далейшага развіцця хакея разглядаліся ў комплексе. Напрыклад, прынята рашэнне, што пачынаючы з гэтага або наступнага квартала важнейшыя спартыўныя функцыянеры ў хакеі будуць назначацца толькі па ўзгадненні з Федэрацыяй хакея.

Сур'ёзную ўвагу Аляксандр Лукашэнка ўдзяліў і тэме загружанасці спартыўных аб'ектаў, развіццю масавага спорту. Прэзідэнт запатрабаваў эфектыўных рашэнняў і падыходаў, дзякуючы якім удасца вывесці беларускі спорт на больш высокі ўзровень.

У час нарады разглядаліся праблемы, вырашэнне якіх дасць магчымасць узняць на больш высокі ўзровень падрыхтоўку будучых зорак хакея. І хоць асноўнай тэмай нарады было развіццё хакея, фактычна закраналіся праблемныя пытанні ва ўсіх відах спорту.

## АФІЦЫЙНЫ ВІЗІТ ПРЭЗІДЭНТА Ў РАСІЮ ПЕРАНЕСЕНЫ

У сувязі з загружанасцю працоўных графікаў прэзідэнтаў Беларусі і Расіі ўзгоднены перанос афіцыйнага візіту кіраўніка беларускай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі ў Расію. Пра гэта БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. Канкрэтныя тэрміны візіту будуць узгоднены па дыпламатычных каналах.

# Гуляў Міхайла па Міхайлаўцы



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзень, які ў народзе называюць Міхайлам, стаў для жыхароў вёскі Міхайлаўка Светлагорскага раёна святочным. Асабліва для 85-гадовай **Лідзіі БЕЛАЙ** (на здымку яна са сваімі ўнукамі Ксеніяй і Мікалаем): нарэшце, яна дачакалася ікону архангела Міхаіла — галоўную святыню вёскі. Жанчына верыла і чакала шчаслівага моманту, калі нябесны апякун Міхайлаўкі прыйдзе ў яе дом. Здавалася, у атэістычныя гады можна было назаўсёды пахаваць гэтую «крамольную» мару, але перарваная традыцыя пераносіць ікону з хаты ў хату зноў вярнулася ў вёску.

— Гэта сапраўдны цуд! — хвалюючыся, паўтарае баба Ліда.

Ужо дваццаць адзін год святыня вандруе па міхайлаўскіх хатах, дае вяскоўцам веру і надзею, нясе радасць і суцяшэнне. Пра тое, як жыхары вёскі ўшаноўваюць сваю старажытную традыцыю і чаму Лідзія Белая так чакала ікону з выявай архангела, **чытайце на 8-й старонцы.**

*ЛІЧБА ДНЯ*

***Br6 млн 646,5 тыс.***

*склала намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў Беларусі ў студзені—кастрычніку гэтага года, у тым ліку ў кастрычніку — Br6 млн 837,6 тыс. Аб гэтым паведаміў карэспандэнту БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Паводле аператыўных даных, у кастрычніку ў прамысловасці сярэдняя заработная плата склала Br7 млн 325,4 тыс., у будаўніцтве — Br8 млн 263,5 тыс., на транспарце і ў сувязі — Br7 млн 749,9 тыс., у сельскай і лясной гаспадарцы — Br4 млн 913 тыс., у адукацыі — Br4 млн 899 тыс., у тым ліку настаўнікаў — Br5 млн 926,7 тыс., прафесарска-выкладчыцкага складу — Br8 млн 14 тыс.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.11.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 18042,00 | ▲ |
| Еўра | 19185,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 274,94 | ▲ |
| Укр. грыўня | 753,71 | ▲ |

■ Нацыянальны адпачынак

# СЕЛЬСКІ ТУРЫЗМ: СТВОРЫМ КРАІНЕ ІМІДЖ

**Агратурызм імкліва набірае вялікую папулярнасць ва ўсім свеце. У тым ліку і ў нашай краіне. Шматлікія турысты, і замежныя, і нашы, ахвотна наведваюць беларускія сядзібы, дзе далучаюцца да культуры, рамёстваў, актыўнага адпачынку і нацыянальнай кухні. Адпачынак у вёсцы ўваходзіць у моду таксама і сярод моладзі, якая цікавіцца гісторыяй, спадчынай продкаў. Сельскі і экалагічны турызм развіваецца ў краіне ўжо на працягу дзесяці гадоў. Тое, што сёння маюць беларусы ў агратурызме і куды нам варта ў гэтым напрамку рухацца далей, абмяркоўвалі з беларускімі экспертамі спецыялісты з Латвіі, Літвы, Славакіі, Украіны, Расіі і Казахстана.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## У нашу вёску едуць нават з Аўстраліі!

Аграрны турызм адзін з найбольш перспектыўных для развіцця эканомікі краіны. Гэты напрамак здольны прыцягнуць немалую валютную выручку, стварыць новыя працоўныя месцы ў сельскай мясцовасці. Але самае важнае тое, што агратурызм стварае гісторыка-культурны імідж дзяржавы. Сёння ў нашай краіне налічваецца больш за 2 тысячы сельскіх сядзіб. Для параўнання, 10 гадоў таму іх было ўсяго толькі 23. Дзясяткі тысяч турыстаў штогод атрымліваюць магчымасць адкрыць Беларусь з новага боку, бо ўсе сядзібы маюць індывідуальны падыход да кліента. Нават самаму пераборліваму наведвальніку тут могуць знайсці занятак у любую пару года. На нашых сядзібах можна і парыбачыць, і правесці вечар ля каміна, пазбіраць грыбы і ягады. Ёсць магчымасць і пачаставацца найлепшымі стравамі беларускай кухні.

СТАР. 2

■ Глыбінка

# «САДОК» — БАБУЛЯМ, «УНІВЕРСІТЭТ» — АСАБЛІВЫМ ЛЮДЗЯМ

**Пажылыя жанчыны з глыбінкі і на пенсіі вядуць актыўны лад жыцця. Яны наведваюць гурткі па інтарэсах, займаюцца на трэнажорах, збіраюць калекцыю прадметаў даўніны. А яшчэ дапамагаюць супрацоўнікам аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў працаваць з людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі. У незвычайнай установе пабываў карэспандэнт «Звязды».**

У гарадскім пасёлку Ветрына Полацкага раёна ў двухпавярховым будынку працуюць «дзіцячы садок» для пенсіянераў, «універсітэт» для інвалідаў і цэнтр па аказанні сацыяльных паслуг.

— У Ветрына знаходзяцца тры аддзяленні: дзённага знаходжання грамадзян пажылога ўзросту, тэрміновага сацыяльнага абслугоўвання, дзённага знаходжання для інвалідаў. Каму з інвалідаў нязручна да нас дабірацца, прывозім на заняткі на аўто. Ёсць і такія «студэнты», якім супрацьпаказана пакідаць дом. Дык кіраўнікі гурткоў рукадзелля да іх прыязджаюць. Гэта робіцца ў рамках праекта «Ляцім на дапамогу». Яго эмблема — пчолка... — распавядае Святлана Касьянава, дырэктар дзяржаўнай установы «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Полацкага раёна». І паказвае кветнікі, цяпліцы, дзе арганізуецца працатэрапія для «асаблівых» людзей.

СТАР. 4

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Су-24 пацярпеў крушэнне ў Сірыі. НАТА правяла экстранную нараду



Як паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на Мінабароны Расійскай Федэрацыі, самалёт Су-24 пацярпеў крушэнне ў Сірыі. У абаронным ведамстве расказалі, што самалёт расійскай авіягрупы пацярпеў крушэнне, як мяркуецца, у выніку абстрэлу з зямлі. Ён ляцеў на вышыні 6 тысяч метраў. Пілотам, па папярэдніх звестках, удалося катапультавацца. Згодна з некаторымі паведамленнямі на інтэрнэт-рэсурсах, адзін з пілотаў загінуў. Лёс другога невядомы. У Мінабароны Расіі пацвердзілі, што Су-24 не парушаў паветранай прасторы Турцыі. Увесь час палёту самалёт знаходзіўся выключна над тэрыторыяй Сірыі. Гэта зафіксавана аб'ектыўнымі сродкамі кантролю. Абставіны падзення расійскага самалёта высвятляюцца. Раней СМІ паведамлялі, што турэцкія ВПС збілі неапазнаны самалёт. Па версіі турэцкага боку, самалёт увайшоў у паветраную прастору Турцыі з боку Сірыі, пасля чаго турэцкія самалёты F-16 па прынятых у рэспубліцы правілах рэагавання збілі яго. У сувязі з падзеннем расійскага бамбардзіроўшчыка Су-24 на тэрыторыі Сірыі, НАТА ўчора ўвечары правяла экстранную нараду. Пасяджэнне праводзілася на ўзроўні паслоў, ніякіх мерапрыемстваў для прэсы не прадугледжвалася. Тым часам у МЗС Вялікабрытаніі назвалі інцыдэнт з падзеннем Су-24 «вельмі сур'ёзным». У ААН раней заявілі, што сітуацыя са збітым расійскім самалётам можа ўскладніць барацьбу з тэрарызмам на тэрыторыі Сірыі.

### У Егіпце ўзарваліся дзве бомбы

Дзве бомбы падарваліся ў Егіпце па-за межамі гатэля, у якім былі размешчаны члены выбарчай камісіі. Як паведамляе егіпецкае дзяржаўнае тэлебачанне, загінуў адзін чалавек. Выбухі ў горадзе Эль-Арыш адбыліся на наступны дзень пасля завяршэння другога тура парламенцкіх выбараў. Пакуль ніхто не ўзяў на сябе адказнасць. Сайт ThemaNews паведамляе, што, прынамсі, адна бомба знаходзілася ў аўтамабілі. Галасаванне, якое павінна было вызначыць, хто зойме 596 месцаў у парламенце, праходзіла на фоне росту гвалту і тэрарызму ў краіне. Тэлеканал Аль-Арабія паказвае на шматлікія сведчанні аб подкупе і іншыя парушэнні падчас выбараў.

ISSN 1990 - 763X

15228>

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Суперпрадукты пазбаўляюць ад тлушчавых адкладанняў

Гэта какосавы воцат, карыца, ламінарыя, малако з куркумой, гранатавы сок і палыновы чай (піша The Daily Mail). Какосавы воцат вельмі падобны да іншых відаў воцату. Яго пераважна выкарыстоўваюць у кухні Паўднёва-Усходняй Азіі. У ім шмат мінеральных рэчываў (асабліва калію), якія дапамагаюць кантраляваць цукар і паскараюць абменныя працэсы. Дыетолагі раяць змяшаць адну сталовую лыжку воцату з цёплай вадой. Такім чынам атрымаецца «ранішні напой», з якога лепш пачынаць дзень. Альтэрнатыва — воцат можна дабаўляць у салаты. Карыца паскарае метабалізм і не дае ўтварацца тлушчавым адкладанням. А яшчэ яна зніжае ўзровень цукру, які звычайна павышаны ў поўных людзей. Карыцу можна дабаўляць у гарачыя напоі (чай, каву) або ў кашу. У сваю чаргу, ламінарыя — сапраўдная скарбніца рэчываў, якія паскараюць працэс стрававання, і ёду, што пазітыўна адбіваецца на абмене рэчываў. Малако з куркумой стымулюе выпрацоўку жоўці, а яна дапамагае расшчапляць ежу і пераварваць тлушчы. Куркума прадухіляе ўздуцце і газаўтварэнне. У гранатах шмат антыаксідантаў. А палыновы чай выдатна выводзіць таксіны з цела і падтрымлівае здаровы абмен рэчываў. Аднак ім нельга злоўжываць.



ДА ВЕДАМА

### ЯК БУДЗЕМ АДПАЧЫВАЦЬ У СВЯТЫ

**Савет Міністраў Беларусі зацвердзіў графік пераносу рабочых дзён у 2016 годзе.**

На праваслаўныя Каляды нас чакаюць чатырохдзённыя канікулы: выхаднымі будуць 7, 8, 9 і 10 студзеня. Працоўны дзень з пятніцы, 8 студзеня, пераносіцца на суботу, 16 студзеня. Таксама працоўны дзень з панядзелка, 7 сакавіка, пераносіцца на суботу 5 сакавіка. Што да гэтага года, то святкаваць каталіцкія Каляды і Новы год мы будзем па тры дні: 25 снежня і 1 студзеня прыпадаюць на пятніцу.

Арганізацыям прадастаўлена права з улікам спецыфікі вытворчасці (працы) ажыццяўляць перанос рабочых дзён у іншым парадку ў адпаведнасці з заканадаўствам.

**Святлана БУСЬКО.**




# АЛЁ, ГАРАЖ!..

## Прыстанак для «жалезнага каня» павінен быць бяспечным

**У гаражах і гаражных кааператывах пажары здараюцца нячаста. Але ўрон, які яны прыносяць, можа быць каласальным з-за моцных пашкоджанняў аўтамабіля, што каштуе не адну тысячу долараў, не кажучы ўжо пра выдаткі на аднаўленне самога гаража. А можа да таго ж пацярпець і прыватны дом. У кааператывах агонь рызыкуе распаўсюдзіцца на гаражы, якія стаяць побач. Балазе гэтаму садзейнічае цесната і загрувашчанасць.**



Зусім хутка надыдзе зіма. У гэты час года многія аўтааматары лічаць патрэбным часова прыпыніць эксплуатацыю свайго «жалезнага каня» да вясны: каб перавесці аўто на зімні лад, патрэбны дадатковыя капіталаўкладанні, ды і ўмовы бяспечнага кіравання ў цёмны час сутак і галалёд куды больш складаныя. І лепшае месца для «кансервацыі» аўтамабіля, чым гараж, знайсці складана. Як жа правільна трэба сябе паводзіць у такім месцы? Аб гэтым карэспандэнт «Звязды» папрасіў расказаць **памочніка міністра па надзвычайных сітуацыях Віталя НАВІЦКАГА.**

### ПА АДЗІНЫХ ПРАВІЛАХ

— Ад ліпеня мінулага года ў краіне запрацавалі адзіныя Правілы пажарнай бяспекі, юрысдыкцыя якіх распаўсюджваецца і на гаражы. Раней жа даводзілася працаваць з вялікай колькасцю дакументаў, цяпер уся нарматыўная база стала ўніфікаванай.

Асноўная прычына, чаму гараць гэтыя пабудовы, — неасцярожнае абыходжанне з агнём. Гаворачы інакш, гаспадары аўтамабіляў займаюцца нейкімі рамонтнымі работамі ў гаражы, выкарыстоўваючы адкрыты агонь або электрычныя прыборы і не зважаючы пры гэтым на існуючыя нормы.

СТАР. 4